Ostrogorski Centre BelarusDigest



# Рэформа юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і досвед Вялікабрытаніі


## Яраслаў Крывой, Раман Мароз



Аналітычны дакумент 11 | 19 сакавіка 2018 года


Фота: Цэнтр Астрагорскага, flickr.com


Мінск
2018

Ostrogorski Centre
www.ostrogorski.org

**Minsk**
minsk@ostrogorski.org

**London**
london@ostrogorski.org

ISSN 2056-8525

Даследаванне падтрыманае

British Embassy
Minsk

Гэты дакумент даступны на:
http://belarusdigest.com/papers/legal-education-reform-belarus.pdf

# Змест

Словы падзякі 4

Рэзюмэ 5

Уводзіны 6

1. Сістэма юрыдычнай адукацыі ў Вялікабрытаніі 6

2. Рэфармаванне юрыдычнай адукацыі ў Беларусі 8

3. Арганізацыя навучальнага працэсу 10

4. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы юрыдычнай адукацыі 12

5. Юрыдычная адукацыя і прафесійныя навыкі 14

6. Рэкамендацыі 16

Пра аўтараў 19

Пра Цэнтр Астрагорскага 20

# Словы падзякі

Аўтары даследавання выказваюць падзяку ўсім выступоўцам канферэнцыі за абмен ідэямі і прафесійным досведам: Сяргею Балашэнку (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), Сяргею Каспяровічу (Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь), Сяргею Ходзіну (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), Канстанціну Дзегцярову (Універсітэт Ліверпуля), Алене Грыгаровіч (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт), Аляксандру Храпуцкаму (адвакацкае бюро “Сысуеў, Бондар, Храпуцкі”), Ірыне Эсмантовіч (Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт), Дар’і Ландо (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), Андрэю Козіку (Асацыяцыі міжнароднага права і арбітража), Вадзіму Самарыну (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт).

Асаблівая падзяка пасольству Вялікабрытаніі ў Беларусі і юрыдычнаму факультэту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта за падтрымку і ўдзел у арганізацыі канферэнцыі.

# Рэзюмэ


- Беларусь не з'яўляецца выключэннем з існуючых тэндэнцый паляпшэння прафесійнай і акадэмічнай якасці падрыхтоўкі юрыстаў, бо рэформы юрыдычнай адукацыі адбываюцца амаль ва ўсіх краінах. У кожнай сістэмы ёсць свае падставы для паляпшэння якасці юрыдычнай адукацыі, але агульнай з'яўляецца праблема ўладкавання на працу маладога юрыста пасля заканчэння ўніверсітэта.

- Нядаўна зацверджаная Канцэпцыя аб развіцці юрыдычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь да 2025 года часткова закранае праблемы, з якімі сутыкнулася сучасная беларуская юрыдычная супольнасць: недахоп практыкаарыентаваных курсаў для студэнтаў, неабходнасць узняць узровень падрыхтоўкі выкладчыкаў, і інш.

- На погляд беларускай юрыдычнай супольнасці, асноўнымі недахопамі сучаснай беларускай юрыдычнай адукацыі таксама з'яўляюцца праблемы перагружанасці выкладчыкаў лекцыйнымі гадзінамі, адсутнасць вузкай спецыялізацыі, забюракратызаваныя механізмы атрымання замежных грантаў, недастатковае фінансаванне стажыровак выкладчыкаў за мяжой, недахоп ведання замежных моў, адсутнасць лічбавых адукацыйных платформ (як у выглядзе доступу да перадавых сусветных бібліятэк, так і распрацоўкі ўнутраных платформ для размяшчэння матэрыялаў настаўнікамі і студэнтамі).

- Беларусь займае 52 месца у індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу сярод 188 краін Праграмы развіцця ААН, што ёсць адным з самых высокіх паказчыкаў сярод краін усходнееўрапейскага рэгіёна. Гэта азначае, што Беларусь з'яўляецца канкурэнтаздольнай у галіне асветы і паляпшэнні юрыдычнай адукацыі. Для рэформы беларускай юрыдычнай адукацыі варта прыцягваць шырокае кола прафесіяналаў, супрацоўнічаць з недзяржаўнымі адукацыйнымі ўстановамі (асацыяцыямі) і на сталай аснове абменьвацца досведам з замежнымі калегамі.

# Уводзіны

Аснову гэтага даследавання склалі ідэі і прапановы, выказаныя падчас канферэнцыі, якую 28 снежня 2017 года ў Мінску правялі Цэнтр Астрагорскага і юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пры падтрымцы амбасады Вялікабрытаніі.

Канферэнцыя была прысвечаная пытанням юрыдычнай адукацыі і яе рэфармаванню ў Беларусі і Вялікабрытаніі. Яна дазволіла навукоўцам абмеркаваць лепшыя практыкі і тэндэнцыі ў галіне юрыдычнай адукацыі. Асноўныя тэмы датычыліся арганізацыі навучальнага працэсу, удасканалення прафесійных навыкаў студэнтаў і спецыялістаў, а таксама магчымасцяў міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы юрыдычнай адукацыі.

Для Беларусі, дзе роля дзяржавы ў эканоміцы застаецца істотнай, далейшае развіццё прававой сістэмы і падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне права павінна быць прыярытэтам. Вяршэнства права з’яўляецца неабходнай асновай для рынкавай эканомікі. Яно забяспечвае асяроддзе для стварэння і захавання багацця, эканамічнай бяспекі і дабрабыту, а таксама паляпшэння якасці жыцця. Усталяванне вяршэнства права з’яўляецца выклікам для ўсіх постсавецкіх дзяржаў у працэсе іх пераходу да рынкавай эканомікі.

Для Беларусі, дзе роля дзяржавы ў эканоміцы застаецца істотнай, далейшае развіццё прававой сістэмы і падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне права павінна быць прыярытэтам.

# 1. Сістэма юрыдычнай адукацыі ў Вялікабрытаніі

Для лепшага разумення сістэмы юрыдычнай адукацыі Вялікабрытаніі мы падаем агляд адукацыйнай сістэмы гэтай краіны. Ключавым адрозненнем брытанскай сістэмы ад беларускай з’яўляецца наяўнасць не толькі акадэмічнага, але і прафесійнага кампанента адукацыі.[1]

Акадэмічная ступень уяўляе сабой першы ўзровень вышэйшай адукацыі (undergraduate degree)[2], які звычайна доўжыцца тры гады, пасля чаго выпускнік атрымлівае статус бакалаўра (*BA* альбо *LLB*).[3] Розніца паміж *BA* і *LLB* палягае ў тым, што студэнту са ступенню *BA* для пачатку прафесійнай дзейнасці трэба будзе ў дадатак прайсці курс юрыдычнай перападрыхтоўкі[4]. Такое патрабаванне абумоўлена тым, што ступень *BA* можа не ўключаць шмат абавязковых прававых курсаў, такіх як публічнае права, права Еўрапейскага саюза, кантрактнае права.[5] Курс прававой перападрыхтоўкі звычайна доўжыцца адзін год паўнавартаснага навучання. Зарэгістравацца на яго можа любы студэнт апошняга курса навучання.[6]

---

1 Partington, Martin, ‘Academic Lawyers and Legal Practice in England: Towards a New Relationship?’ Legal Education Review, 1992, < http://www.austlii.edu.au/au/journals/LegEdRev/1992/4.html > [accessed 1 January 2018]; Boon, Andrew, Webb, Julian, ‘Legal Education and Training in England and Wales: Back to the Future’ (Journal of Legal Education Vol. 58 No.1 2008) p. 80.

2 Solicitor Regulation Authority ‘Academic Stage Handbook (version 1.4, July 2014)’ <https://www.sra.org.uk/students/academic-stage.page> [accessed 1 January 2018].

3 Bowes, Lauren,“What is BA Law?” (AllAboutLaw, 9 February 2018) <https://www.allaboutlaw.co.uk/stage/law-degree/what-is-ba-law> [accessed 1 January 2018].

4 Solicitors Regulation Authority, ‘Academic Stage Handbook (version 1.4, July 2014)’, <https://www.sra.org.uk/students/academic-stage.page> [accessed 1 January 2018].

5 Ibid.

6 Swain, Rachel, ‘Law Conversion Courses’ (Prospects, June, 2017) <https://www.prospects.ac.uk/jobs-and-work-experience/job-sectors/law-sector/law-conversion-courses> [accessed 1 January 2018].



Фота: flickr.com

Працягласць і складанасць прафесійнай ступені навучання залежыць ад таго, ці плануе студэнт стаць барыстарам (ад англ. *barrister* – юрыст, які мае права выступаць у судзе)[7] або салісітарам (ад англ. *solicitor* – юрыст, які мае права даваць юрыдычныя парады).[8]

Каб стаць барыстарам, неабходна скончыць адпаведныя курсы ў прафесійнай юрыдычнай установе, якія доўжацца адзін акадэмічны год. Пасля курсаў студэнту будзе неабходна здаць экзамен і прайсці абавязковую платную гадавую стажыроўку (*pupillage*) пад наглядам дасведчанага барыстара.[9] Каб стаць салісітарам, прэтэндэнт таксама павінен скончыць адпаведны гадавы практычны курс, пасля чаго яго будзе чакаць ужо двухгадовая стажыроўка пад наглядам кваліфікаванага салісітара (*recognized training*).[10]

***Case study***

## Рэйтынгі юрыдычных факультэтаў

Якасць юрыдычнай адукацыі ў Вялікабрытаніі ацэньваецца рознымі спосабамі, у тым ліку праз рэйтынгі юрыдычных факультэтаў. Чым вышэйшая пазіцыя ўніверсітэта ў такім рэйтынгу, тым большы ягоны прэстыж. У Вялікбрытаніі выдзяляюць тры буйныя крыніцы, якія публікуюць свае рэйтынгі: газета The Guardian, газета The Times & The Sundays Times, а таксама Інтэрнэт платформа Complete University Guide. Кожная з гэтых крыніц выкарыстоўвае свой асабісты набор крытэраў для складання рэйтынгу. Паводле апошніх публікацый, найлепшыя юрыдычныя школы месцяцца ва ўніверсітэтах Кембрыджа, Оксфарда, а таксама у буйных лонданскіх ўстановах.

У Вялікабрытаніі таксама распрацаваная сістэма паслядыпломнай акадэмічнай адукацыі (*postgraduate courses*), якая накіраваная на паглыбленне ведаў у пэўнай вузкай галіне права.[11] Завяршэнне такой праграмы звычайна вядзе да атрымання ступені магістра права (*LLM*).

---

7 Bar Standards Board, ‘Glossary of Common Terms at the Bar’ <https://www.barstandardsboard.org.uk/media/1727709/2016_cp_section_19_-_3annex_6_-_glossary_of_terms_-_handbook_-_final.pdf> [accessed 1 January 2018].

8 Ibid.

9 Bar Standard Board, ‘The Bar Standards Board Handbook (version 3.2, February 2018)’ < https://www.barstandardsboard.org.uk/media/1918141/bsb_handbook_1_february_2018.pdf > [accessed 1 January 2018].

10 Solicitor Regulation Authority, ‘SRA Training Regulations 2014’ <https://www.sra.org.uk/solicitors/handbook/trainingregs2014/content.page> [accessed 1 January 2018].

11 Flood, John, ‘Legal Education in the Global Context Challenges from Globalization, Technology and Changes in Government Regulation’, University of Westminster School of Law Research Paper #11-16, p. 8. August 2011, 2.

Тыя ж, хто імкнецца пабудаваць кар’еру ў акадэмічнай сферы, паступаюць ў дактарантуру, якая дае магчымасць за тры або чатыры гады атрымаць ступень доктара філасофіі ў галіне права (*PhD*).[12]

*Табліца 1. Крытэры для складання рэйтынгаў універсітэтаў у Вялікабрытаніі*

| The Guardian | The Times & The Sunday Times | Complete University Guide |
|---|---|---|
| (1) патрабаванні для заліку ва ўніверсітэт<br>(2) задаваленне студэнтаў курсамі, агульнай якасцю адукацыі і прафесарскім складам<br>(3) колькасць студэнтаў на аднаго прафесара<br>(4) колькасць грашовых сродкаў, якія былі выдаткаваны на кожнага студэнта<br>(5) акадэмічныя поспехі студэнтаў<br>(6) колькасць уладкаваных на працу студэнтаў пасля шасці месяцаў ад заканчэння ўніверсітэта[13] | (1) патрабаванні для заліку ва ўніверсітэт<br>(2) задаваленне студэнтаў курсамі, агульнай якасцю адукацыі і прафесарскім складам<br>(3) колькасць студэнтаў на аднаго прафесара<br>(4) колькасць атрыманых студэнтамі дыпломаў<br>(5) колькасць ступеняў<br>(6) кар’ера студэнтаў<br>(7) якасць даследаванняў<br>(8) колькасць рэсурсаў, затрачаных на кожнага студэнта[14] | (1) патрабаванні для заліку ва ўніверсітэт<br>(2) задавальненне студэнтаў курсамі, агульнай якасцю адукацыі і прафесарскім складам<br>(3) колькасць студэнтаў на аднаго прафесара<br>(4) колькасць атрыманых студэнтамі дыпломаў<br>(5) колькасць ступеняў<br>(6) кар’ера студэнтаў<br>(7) якасць даследаванняў<br>(8) інтэнсіўнасць даследаванняў<br>(9) колькасць рэсурсаў, выдаткаваных на кожнага студэнта<br>(10) колькасць акадэмічных паслуг на студэнта[15] |

# 2. Рэфармаванне юрыдычнай адукацыі ў Беларусі

У беларускай юрыдычнай супольнасці, як сярод практыкаў, так і навукоўцаў, выказваецца шэраг прапаноў па паляпшэнні якасці юрыдычнай адукацыі.[16] Сярод асноўных праблем – недастатковая канкурэнтаздольнасць нацыянальнай сістэмы юрыдычнай адукацыі; неадпаведнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу высокапрафесійнымі выкладчыкамі; адсутнасць вучэбных праграм, арыентаваных на падрыхтоўку спецыялістаў у сферы новых тэхналогій; слабы фокус на развіцці практычных навыкаў падчас навучання; недастатковае фінансаванне юрыдычнай навукі і іншыя.[17]
Для вырашэння дадзеных праблем у Беларусі была прынятая Канцэпцыя

12 Fallon, Maurice, ‘Overview of PhD studies in the UK’ <http://www.robots.ox.ac.uk/~mfallon/phdstudies/> [accessed 1 January 2018].
13 Methodology Behind the Guardian University Guide’ <https://www.theguardian.com/education/2016/may/23/methodology-behind-the-guardian-university-guide-2017> [accessed 1 January 2018].
14 ‘Good University Guide 2018’, The Sunday Times <https://www.thetimes.co.uk/article/good-university-guide-2018-in-full-tp6dzs7wn> [accessed 1 January 2018].
15 ‘The Complete University Guide’, Complete University Guide <https://www.thecompleteuniversityguide.co.uk/league-tables/methodology> [accessed 1 January 2018].
16 Латышева, Марина, «Проблемы юридического образования в Республике Беларусь» <http://www.profmedia.by/pub/bnp/art/detail.php?ID=64695> [дата доступа 1 Января 2018 года]; Калинин, Сергей Артурович, ‘Проблемы реформирования юридического образования: попытка системного анализа» Юриспруденция XXI века: горизонты развития,’ <http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/12912/1/Калинин,%20С.А.%20Проблемы%20реформирования%20юридического%20образования_попытка%20системного%20анализа%202006..pdf > [дата доступа 1 Января 2018 года]; Кирвель, И. Ю., ‘Повышение уровня юридического образования с учетом тенденций общественного развития’, <http://elib.grsu.by/katalog/163939-355983.pdf> [дата доступа 1 Января 2018 года].
17 Концепция развития юридического образования до 2025 года [2017].

аб развіцці юрыдычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь да 2025 года. Канцэпцыя ставіць перад сабой амбіцыйныя мэты па перазагрузцы юрыдычнай адукацыі, пабудове супрацоўніцтва з замежнымі ўстановамі, а таксама пераарыентацыі на законы рынку.[18]

Варта адзначыць, што ў Беларусі ў 2006 годзе ўжо была зацверджана Канцэпцыя аб развіцці юрыдычнай адукацыі на 2006 – 2010 год.[19] Галоўнай мэтай распрацоўкі і зацвярджэння Канцэпцыі тады стала стварэнне навукова абгрунтаванай сістэмы падрыхтоўкі юрыдычных кадраў дзеля іх эфектыўнага выкарыстання ва ўсіх галінах грамадскага жыцця і вырашэння існуючых праблем.




Фота: Цэнтр Астрагорскага

Сярод найбольш вострых праблем Канцэпцыя 2006 года вызначыла нізкі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў, адсутнасць высокакваліфікаваных адукацыйных кадраў, а таксама недастатковасць навуковых і адукацыйных выданняў.[20] Улічваючы, што цяперашняя Канцэпцыя звяртае ўвагу на тыя ж самыя праблемы, можна выказаць меркаванне, што папярэднія захады шмат у чым не дасягнулі пастаўленых мэтаў.

Выкананне новай Канцэпцыі распачалося толькі ў 2018 годзе, і пакуль яшчэ рана рабіць высновы. Аднак ужо сёння сярод юрыстаў выказваюцца скептычныя погляды на Канцэпцыю па прычыне дэкларатыўнасці некаторых яе палажэнняў. Таксама адзначаецца, што Канцэпцыя праігнаравала шмат важных праблем, такіх як стварэнне англамоўнай юрыдычнай бібліятэкі, спрыянне публікацыям беларускіх выкладчыкаў на англійскай мове, паляпшэнне якасці выкладання замежных моў на юрыдычных факультэтах, заахвочванне студэнтаў да ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах (напрыклад, *moot courts*) і стварэнне ва ўніверсітэтах кар’ерных цэнтраў.

Неабходна адзначыць, што Беларусь не адзіная ў сваім рэгіёне краіна, якая імкнецца рэфармаваць юрыдычную адукацыю. Ва Украіне сёння актыўна абмяркоўваецца пытанне аб удасканальванні сістэмы юрыдычнай адукацыі.[21] З гэтай нагоды створаны не толькі праект рэформы юрыдычнай

---

18 Ibid.

19 ‘Утверждена Концепция развития юробразования в Беларуси на 2006 – 2010 годы’ <https://neg.by/novosti/otkrytj/utverzhdena-koncepciya-razvitiya-yurobrazovaniya-v-belarusi-na-2006-2010-gody-4926> [дата доступа 1 Января 2018 года].

20 Постановление Министерства образования и Министерства юстиции Республики Беларусь от 13 июня 2006 года №61/30 “О мерах по совершенствования системы по подготовке юридических кадров в Республике Беларусь” <http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=W20615138 > [дата доступа 1 Января 2018 года].

21 ‘Аналіз проекту Концепції реформування юридичної освіти в Україні в світлі отриманих відгуків за результатами регіональних презентацій проекту Концепції’ <http://newjustice.org.ua/wp-content/uploads/2017/09/NJ_Y.Barabash_Report-on-Draft-LER-Concept-Paper-and-Recommendations-for-Improvement_May-22_2017.pdf> [accessed 1 January 2018].

асветы[22], але і пабудаваная паўнавартасная Інтэрнэт-платформа, на якой абмяркоўваюцца ўсе сучасныя праблемы юрыдычнай адукацыі, даследуецца рынак працы і вывучаецца досвед Злучаных штатаў Амерыкі і Германіі ў гэтай сферы.[23] Таксама шырока выкарыстоўваюцца грамадскія абмеркаванні, каб зрабіць рэформы больш канкрэтнымі і паспяховымі.

# 3. Арганізацыя навучальнага працэсу

Працэс атрымання прававой адукацыі ў Беларусі істотна адрозніваецца ад аналагічнага працэсу ў Вялікабрытаніі. Беларускім адукацыйным установам варта было б уважліва разгледзець некаторыя аспекты брытанскага досведу. Першы напрамак – гэта колькасць абавязковых лекцыйных гадзін і навукова-даследчая дзейнасць выкладчыкаў. Англійскія выкладчыкі чытаюць нашмат менш лекцый у параўнанні са сваімі беларускімі калегамі.

Значную частку сваёй працы англійскія выкладчыкі прысвячаюць профільным навуковым даследаванням.[24] Рэгулярная навуковая дзейнасць не толькі дапамагае вырашаць канкрэтныя тэарэтычныя і практычныя праблемы дзяржавы, але і істотна падвышае ўзровень іх кампетэнцыі, што, у сваю чаргу аказвае станоўчы ўплыў на выкладанне прававых дысцыплін.[25]

Вызваліць час выкладчыкаў для навуковых даследаванняў можна праз скарачэнне колькасці абавязковых лекцыйных гадзін. Студэнты мусяць самастойна працаваць з навучальнымі матэрыяламі, а лекцыі выкарыстоўваць для непасрэднага абмеркавання ўзніклых пытанняў ці дыскусій па прававых праблемах дадзенай дысцыпліны.

Навучыць студэнтаў працаваць самастойна – гэта адна з галоўных задач навучальнага працэсу. Акрамя таго, беларускія ўніверсітэты мусяць ствараць адпаведныя ўмовы для арганізацыі прававых даследаванняў, напрыклад, актыўней удзельнічаць у праграмах міжнароднага акадэмічнага абмену выкладчыкаў і спрыяць англамоўным публікацыям.

Вызваліць час выкладчыкаў для навуковых даследаванняў можна праз скарачэнне колькасці абавязковых лекцыйных гадзін.

Другі напрамак – гэта працягласць навучання. На дадзены момант атрыманне ступені бакалаўра права ў Англіі займае тры гады,[26] тады як у Беларусі – чатыры гады. Тры гады – гэта больш аптымальны тэрмін для атрымання вышэйшай прававой адукацыі, бо ён дазваляе ахапіць значную колькасць прадметаў і скараціць нагрузку на ўніверсітэты. Істотна, каб беларускія ўніверсітэты пазбавіліся прадметаў, якія не маюць непасрэднага дачынення да выкладання права, напрыклад, абавязковай фізкультуры.

---

[22] 'Концепція вдосконалення праввнічої (юрідічної) освіти для фахової підготовки правника' <https://mon.gov.ua/ua/osvita/visha-osvita/koncepciya-vdoskonalennya-pravnichoyi-yuridichnoyi-osviti-dlya-fahovoyi-pidgotovki-pravnika > [accessed 1 January 2018].

[23] 'Підготвка проекту Концепції рэформірования юрідічноі освіті в Україні' <https://www.dropbox.com/sh/13iycjb234akxl0/AABHVWKDxcOdDkT_GseHrzPfa?dl=0> [accessed 1 January 2018].

[24] Matthew, David, 'How Scholars Spend Their Time' (The World University Rankings, 3 March 2016) <https://www.timeshighereducation.com/news/infographic-how-scholars-spend-their-time> [accessed 1 January 2018].

[25] Ginsburg, Tom, Miles, Thomas J., 'The Teaching/ Research Tradeoff in Law: Data from the Right Tail' (Coase-Sandor Institute for Law & Economics Working Paper No. 674, 2014) <https://chicagounbound.uchicago.edu/cgi/viewcontent.cgi?referer=https://www.google.co.uk/&httpsredir=1&article=1667&context=law_and_economics> [accessed 1 January 2018].

[26] Mansell, Warwick, 'Law Degree Course Guide' (The Telegraph, 2011) <http://www.telegraph.co.uk/education/universityeducation/degree-courses/8554445/Law-degree-course-guide.html> [accessed 1 January 2018].

Трэці напрамак – гэта пашырэнне арсенала метадаў выкладання. Беларускім адукацыйным установам трэба актыўней прымяняць інавацыйныя метады выкладання прававых дысцыплін, у тым ліку выкарыстоўваць анлайн-платформы для размяшчэння навучальных матэрыялаў (напрыклад, *moodle*), ладзіць сімуляцыі крымінальных і цывільных працэсаў (у тым ліку у міжнародных конкурсах), даваць практычныя заданні ў малых групах.

Чацвёрты напрамак – гэта ацэнка ведаў. Выключна пісьмовая форма іспытаў у Англіі мае свае недахопы, аднак дазваляе істотна павялічыць аб'ектыўнасць выніковых адзнак.[27] У Беларусі, як і ў іншых краінах, існуе праблема плагіяту. У якасці магчымых сродкаў барацьбы з плагіятам неабходна ўводзіць больш строгія санкцыі, набываць адпаведнае праграмнае забеспячэнне і скасаваць рэферат як форму кантролю ведаў.

Пяты напрамак – гэта аплата працы выкладчыкаў. Універсітэцкія выкладчыкі мусяць быць фінансава забяспечаныя: гэта прадухіліць іх ад сыходу з выкладання ў юрыдычную практыку ці іншыя сферы. Пры гэтым да падрыхтоўкі студэнтаў неабходна прыцягваць больш юрыстаў-практыкаў. Актыўны кантакт студэнтаў з юрыстамі-практыкамі патрэбны ў тым ліку для таго, каб студэнты пазбавіліся першапачатковай "рамантызацыі" юрыдычнай прафесіі і пазнаёміліся з рэаліямі будучай прафесіі. Апроч таго, добрая выніковасць курсавых і дыпломных прац назіраецца толькі пры ўмове іх непасрэднай сувязі з юрыдычнай практыкай.



Фота: commons.wikimedia.org

Станоўчы прыклад такой практыкі на канферэнцыі, прысвечанай рэфармаванню юрыдычнай адукацыі, прывяла дэкан Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па словах Алены Грыгаровіч, у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце практыкуючыя юрысты чытаюць лекцыі, распрацоўваюць адукацыйныя праграмы, кіруюць напісаннем курсавых прац, распавядаюць прыклады з уласнай юрыдычнай практыкі.

Універсітэцкія юрыдычная клінікі дазваляюць студэнтам паспрабаваць сябе ў ролі юрыдычных кансультантаў, правесці прыём грамадзян, скласці прававыя дакументы, прааналізаваць юрыдычныя дамовы. Важна ўсталёўваць

[27] Ives, Deborah, 'Guide to Studying Law' (The Complete University Guide) <https://www.thecompleteuniversityguide.co.uk/courses/law/guide-to-studying-law/> [accessed 1 January 2018].

*Case study*

**Бібліятэкі і электронныя рэсурсы**

Кожны з брытанскіх універсітэтаў валодае багатай бібліятэкай, якая, як правіла, у дастатковай ступені забяспечвае патрэбы студэнтаў у сучаснай юрыдычнай літаратуры. Нават калі нейкай асобнай кнігі няма ў фондзе бібліятэкі, яе звычайна можна лёгка замовіць праз сістэму міжуніверсітэцкай пазыкі. Аднак усё больш студэнтаў карыстаецца не папяровымі кнігамі, а электроннымі базамі дадзеных. Менавіта тут месцяцца калекцыі найбольш уплывовых юрыдычных часопісаў з сотнямі актуальных артыкулаў па любым накірунку. Доступ да HeinOnline, LexisNexis, Westlaw, Bloomberg Law і некаторых іншых платформ стаўся неад’емнай часткай паўнавартаснай сучаснай прававой адукацыі.

кантакты з калегіяй адвакатаў, праваабарончымі арганізацыямі і праваахоўнымі органамі.

Акрамя таго, дэкан адзначыла, што мае станоўчыя вынікі працы са студэнтамі падчас рэальных юрыдычных працэсаў. Напрыклад, калі прафесар можа аналізаваць і паведамляць пра правілы рэальных судовых пасяджэнняў як у рэжыме анлайн падчас трансляцыі відэаканферэнцыі судовага пасяджэння, так і па заканчэнні судовага працэсу ў тым выпадку, калі студэнты прысутнічаюць у залі судовых пасяджэнняў.

Не абыходзіцца ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце і без мадэлявання прафесійных сітуацый. Дэкан паведаміла, што на пастановачныя працэсы запрашаюцца юрысты-практыкі ў той ці іншай галіне, якія потым каментуюць гэта мадэляванне.

Дзеля развіцця юрыдычнай навукі ва ўніверсітэце створаны навукова-даследчыя лабараторыі, таксама студэнтам прапануецца курс па метадалогіі навуковай і даследчай дзейнасці.

# 4. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы юрыдычнай адукацыі

Асноўныя праблемы павышэння міжнароднай мабільнасці беларускіх выкладчыкаў палягаюць у адсутнасці арганізацыйнай і матэрыяльнай падтрымкі, недастатковай падтрымцы кіраўніцтвам універсітэтаў акадэмічных абменаў і цяжкасці атрымання віз. Нягледзячы на тое, што прыняцце Канцэпцыі аб развіцці юрыдычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь да 2025 мае на мэце спрыяць мабільнасці беларускіх выкладчыкаў, пакуль цяжка казаць пра пазітыўныя зрухі ў гэтым накірунку.

Дар’я Ландо, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, выказалася па праблеме павышэння мабільнасці выкладчыкаў беларускіх вышэйшых навучальных установах. Для таго, каб беларускія выкладчыкі маглі ўдзельнічаць у міжнародных праграмах акадэмічнага абмену, яны мусяць добра валодаць прафесійнай замежнай лексікай. Тым не менш, беларускія навучальныя ўстановы не арганізуюць дадатковыя курсы акадэмічнага пісьма і прафесійнай замежнай лексікі, таму выкладчыкі мусяць займацца гэтым самастойна. Іншая істотная праблема палягае ў тым, што для паспяховай інтэрнацыяналізацыі беларускай адукацыі не хапае літаратуры на замежных мовах і доступу да баз дадзеных з замежнымі навуковымі часопісамі.

Больш за тое, далёка не ўсе беларускія ўніверсітэты разглядаюць удзел сваіх выкладчыкаў у праграмах акадэмічнай мабільнасці як крытэр іх

прафесійнага росту. Таму існуе патрэба ў павышэнні лаяльнасці вышэйшых навучальных устаноў да ўдзелу выкладчыкаў у праграмах акадэмічнай мабільнасці.

Амаль цалкам адсутнічае фінансаванне замежных паездак: выкладчыкі мусяць разлічваць на замежных партнёраў альбо на ўласныя сродкі. Беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы звычайна не кампенсуюць сваім выкладчыкам і выдаткі на платныя дыстанцыйныя курсы, якія прапануюць замежныя ўніверсітэты.

У дадатак, развіццю акадэмічнай мабільнасці перашкаджаюць цяжкасці з атрыманнем віз і адсутнасць адпаведнасці паміж беларускімі і еўрапейскімі навуковымі ступенямі.

Вадзім Самарын, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адзначыў, што арганізацыя міжнародных адукацыйных праектаў, якія фінансуюцца праз буйных донараў, мае ў Беларусі сваю спецыфіку. Асаблівыя цяжкасці звычайна ўзнікаюць пры рэгістрацыі міжнароднай фінансавай дапамогі ад замежных партнёраў у Міністэрстве эканомікі Рэспублікі Беларусь. Напрыклад, фінансавая дапамога для правядзення сумеснага адукацыйнага праекта рэгіструецца як “міжнародная тэхнічная дапамога”. Таму беларускае заканадаўства ў галіне рэгістрацыі міжнароднай дапамогі мусіць быць сур’ёзна ўдасканалена.

> Для паспяховай інтэрнацыяналізацыі беларускай адукацыі не хапае літаратуры на замежных мовах і доступу да баз дадзеных з замежнымі навуковымі часопісамі.

Іншы прыклад – рэгістрацыя фінансавай дапамогі для правядзення навуковых канферэнцый. Заканадаўства прадугледжвае рэгістрацыйны тэрмін у дзесяць дзён, аднак на практыцы рэгістрацыя можа займаць да двух месяцаў. Існуючая сітуацыя значна ўскладняе міжнароднае супрацоўніцтва паміж беларускімі і замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Тэрмін рэгістрацыі міжнароднай фінансавай дапамогі мусіць быць істотна зніжаны, каб беларускі бок не меў дадатковых праблем з канверсіяй курса замежнай валюты і ўніверсітэцкай бухгалтэрыяй.

Андрэй Козік, старшыня Асацыяцыі міжнароднага права і арбітражу, выказаў меркаванне, што недзяржаўныя арганізацыі маглі б адыгрываць большую ролю ў інтэрнацыяналізацыі юрыдычнай адукацыі ў Беларусі – напрыклад, праз падтрымку ўдзелу беларускіх студэнтаў у міжнародных юрыдычных спаборніцтвах (так званыя *moot courts*) і падрыхтоўку студэнцкіх заявак на паступленне ў замежныя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Паспяховыя выступы на міжнародных юрыдычны конкурсах, у тым ліку на *Philip C. Jessup International Law Moot Court Competition*, паказваюць, што беларускія студэнты здольныя спаборнічаць з найлепшымі ўніверсітэтамі свету.[28] Аднак слабасць моўнай падрыхтоўкі на беларускіх юрыдычных факультэтах і недастатковае валоданне прафесійнай лексікай перашкаджае студэнтам і выкладчыкам дасягаць лепшых вынікаў.

[28] ‘Студентки БГУ выиграли в “суде ООН” у конкурентов из США, Австралии и Великобритании’, 5 апреля 2016 года, TUT.BY, <https://news.tut.by/society/491259.html> [дата доступа 1 января 2018 года].

# 5. Юрыдычная адукацыя і прафесійныя навыкі

Калі ў Вялікабрытаніі агулам назіраецца вельмі моцная канкурэнцыя сярод маладых юрыстаў,[29] то ў Беларусі яна менш выразная. Варта адзначыць, што не ўсе беларускія студэнты ўяўляюць, што будуць рабіць пасля атрымання дыплома, таму жывуць "ад сесіі да сесіі". Шмат хто са студэнтаў не разумее, што праца юрыста патрабуе моцнай самааддачы.

Выбар вузкай спецыялізацыі можа паспрыяць паспяховай юрыдычнай кар'еры. На думку партнёра юрыдычнай фірмы і па сумяшчальніцтву выкладчыка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце Аляксандра Храпуцкага, замест юрыстаў шырокага профілю рынку патрэбныя юрысты больш вузкага профілю, здольныя рабіць параўнальны аналіз. Беларускія ВНУ павінны надаваць больш увагі выхаванню прафесійнай этыкі, а таксама арыентаваць студэнтаў на працу не толькі ў дзяржаўных установах, але і ў іншых сферах, напрыклад, камерцыйнай.

Аляксандр Храпуцкі лічыць, што сучасны студэнт, каб быць канкурэнтаздольным, павінен ведаць не толькі сваю родную мову, але, прынамсі, ангельскую мову. Больш за тое, перавагу сёння часта мае той, хто акрамя права цікавіцца дадатковымі галінамі (напрыклад, правам высокіх тэхналогій) і прысвячае шмат часу самападрыхтоўцы (напрыклад, удасканальваючы замежную мову).

Як адзначыла дэкан юрыдычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, адной з найбуйнейшых праблем для падрыхтоўкі практыкаарыентаваных кадраў з'яўляецца невялікая колькасць гадзін, якія ВНУ самастойна можа ўключыць у вучэбны план. Але, па словах дэкана, ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце распрацаваны шэраг сродкаў, якія кампенсуюць гэты недахоп.

> Перавагу сёння часта мае той, хто акрамя права цікавіцца дадатковымі галінамі (напрыклад, правам высокіх тэхналогій) і прысвячае шмат часу самападрыхтоўцы (напрыклад, удасканальваючы замежную мову).

Сярод іншых праблем узаемадзеяння паміж студэнтамі і арганізатарамі юрыдычнай практыкі – нежаданне некаторых выбітных юрыстаў-практыкаў чытаць лекцыі праз адсутнасць вопыту публічных выступаў. Апроч таго, часам самі студэнты заўважаюць разыходжанне тэорыі з практыкай, напрыклад у судовых інстанцыях, што нараджае шмат пытанняў да выкладчыкаў універсітэта. Яшчэ адзін негатыўны момант — нежаданне пракуратуры браць на практыку студэнтаў, якія маюць адміністрацыйныя парушэнні.

Дэкан юрыдычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта звярнула ўвагу і на тое, што выпускнікі беларускіх ВНУ маюць шэраг праблем з працаўладкаваннем. Гэтыя праблемы звязаны як з эканамічнымі фактарамі – працадаўцы кожны год праводзяць аптымізацыі, і ім не патрэбна такая колькасць юрыстаў – так і з іншымі фактарамі, такімі як адсутнасць дасканалай электроннай платформы, дзе б размяшчаліся ўсе вакансіі для маладых спецыялістаў.

Праблемы з працаўладкаваннем існуюць таксама і ў іншых краінах. Для таго, каб павысіць свае шанцы на добрае працаўладкаванне, у Вялікабрытаніі

[29] Bowcott, Owen, 'Law graduates hit by stiff competition, legal aid cuts and falling crime' June 2014, The Guardian, <https://www.theguardian.com/law/2014/jun/29/law-graduates-legal-aid-university-lawyers> [accessed 1 January 2018].




Фота: ipmmarketing.blogspot.com

і Злучаных штатах Амерыкі студэнт мусіць скончыць прэстыжную навучальную ўстанову з высокім сярэднім балам, а таксама ўдзельнічаць у пазакласнай дзейнасці (напрыклад рэдагуючы студэнцкія часопісы ці выступаючы ў прафесійных конкурсах.[30] Для таго, каб дапамагчы студэнтам знайсці добрую працу, у заходніх краінах пры ўніверсітэтах былі створаны кар'ерныя цэнтры (*career centers*).[31] Кар'ерныя цэнтры знаходзяцца ў пастаянным кантакце з рознымі працадаўцамі, у тым ліку з дзяржаўнымі ўстановамі, камерцыйным сектарам, няўрадавымі арганізацыямі. Можна вылучыць чатыры асноўныя напрамкі працы дадзеных цэнтраў.

Першы напрамак – гэта прадстаўленне студэнтам інфармацыі. Кар'ерныя цэнтры інфармуюць студэнтаў пра заробкі ў розных сферах юрыдычнай дзейнасці, а таксама вучаць, як правільна складаць рэзюмэ, праходзіць сумоўе, пісаць матывацыйны ліст.

Другі напрамак – правядзенне лекцый альбо прыватных заняткаў на розныя тэмы. Лекцыі могуць праводзіць як самі супрацоўнікі кар'ерных цэнтраў, так і запрошаныя спецыялісты з розных арганізацый публічнага ці прыватнага сектара. На прыватных сустрэчах звычайна абмяркоўваюцца пытанні стажыровак і першых крокаў у кар'еры.

[30] 'Law Firms' Preferred Universities'(Chambers Student 2015) <http://www.chambersstudent.co.uk/where-to-start/newsletter/law-firms-preferred-universities> [accessed 1 January 2018].

[31] About LSE Careers <https://info.lse.ac.uk/current-students/careers/about> [accessed 1 January 2018].

*Case study*

## Дзень міжнародных арганізацый

Падчас Дня міжнародных арганізацый, які праводзіўся Лонданскай школай эканомікі ў лістападзе 2017 года прадстаўнікі найбуйнейшых міжнародных арганізацый, уключаючы Сакратарыят ААН, ПРААН, ЮНФПА, МВФ, Сусветны банк і Еўрапейскі саюз, выступалі з прэзентацыямі пра кар'ерныя магчымасці ў кожнай з іх. Каб трапіць на дадзенае мерапрыемства, студэнты Лонданскай школы эканомікі мусілі зарэгістравацца за некалькі тыдняў да яго пачатку. Патрапіць на Дзень міжнародных арганізацый таксама маглі і студэнты іншых універсітэтаў Вялікабрытаніі, але на спецыяльных умовах. Пасля таго, як час прэзентацый скончыўся, з супрацоўнікамі арганізацый можна было непасрэдна паразмаўляць у прыватнай атмасферы каля адпаведных стэндаў і атрымаць дадатковую карысную інфармацыю. Дзень міжнародных арганізацый выконваў ў цэлым выключна азнаямляльную функцыю, для многіх студэнтаў гэта быў унікальны шанец зразумець лепш, як працаваць у міжнародных арганізацыях.




Фота: commons.wikimedia.org

Трэці напрамак – гэта арганізацыя так званых кірмашоў працы, якія ўніверсітэты могуць арганізоўваць як самастойна, так і ў супрацы з іншымі ўніверсітэтамі. Такія кірмашы даюць студэнтам лепшае ўяўленне пра далейшыя кар’ерныя магчымасці, а таксама спрыяюць працаўладкаванню.

Чацвёрты напрамак – гэта правядзенне сустрэч з выпускнікамі, на якіх абмяркоўваецца, што на самой справе адбываецца з студэнтам пасля заканчэння ўніверсітэта. Такім чынам, ужо на першым курсе ў студэнта ёсць шанец даведацца пра свае рэальныя перспектывы і пачаць працаваць у патрэбным рэчышчы.

Што тычыцца навуковай дзейнасці студэнтаў, яна можа стымулявацца рознымі сродкамі. Найбольш эфектыўнымі з іх з’яўляюцца:

- наяўнасць курсаў па акадэмічнаму пісьму і этыцы
- існаванне бюджэту на ўдзел у навуковых канферэнцыях або *moot courts*
- заахвочванне арганізацыі канферэнцый
- развіццё бібліятэкі і існаванне магчымасці пазычыць матэрыялы з іншых універсітэтаў і бібліятэк
- заключэнне дамоўленасцяў паміж рознымі ўніверсітэтамі аб рэгулярных акадэмічных абменах
- існаванне конкурсаў на найлепшую публікацыю
- наяўнасць аддзелаў, якія дапамагаюць удасканаліць моўныя аспекты работы (*language centres*)
- магчымасць працаваць асістэнтам выкладчыка/прафесара
- магчымасць для студэнтаў ацэньваць навуковую працу ўніверсітэта.

# 6. Рэкамендацыі

Прыняцце Канцэпцыі аб развіцці юрыдычнай адукацыі да 2025 года і абмеркаванне гэтай канцэпцыі з акадэмічнай супольнасцю з’яўляюцца важным крокам наперад. Акрамя гэтага, каб палепшыць якасць юрыдычнай адукацыі ў Беларусі, варта таксама ўлічыць перадавы сусветны досвед, прынамсі той, які можна прасачыць у Вялікабрытаніі. На сённяшні дзень можна зрабіць наступныя рэкамендацыі беларускім навучальным установам.



Фота: commons.wikimedia.org

- **Павялічыць час самастойнай працы студэнтаў і вызваліць час выкладчыкаў для навуковай дзейнасці**

Навучальным установам карысна было б скараціць колькасць абавязковых лекцыйных гадзін на юрыдычных факультэтах з мэтай вызвалення часу для навуковай дзейнасці выкладчыкаў. Беларускія студэнты, у сваю чаргу, мусяць вучыцца самастойна працаваць з навучальнымі матэрыяламі, каб развіваць свае аналітычныя навыкі і крытычнае мысленне. Прадметы, якія не звязаны з выкладаннем права, павінны быць скарочаныя. Гэта дазволіць беларускім студэнтам зэканоміць адзін год навучання і раней перайсці да юрыдычнай практыкі. Пры ацэнцы студэнцкіх ведаў варта больш увагі надаваць пісьмовым працам.

- **Уключыць беларускую юрыдычную адукацыю ў міжнароднае супрацоўніцтва**

Каб беларуская адукацыйная супольнасць у сферы адукацыі не была адарвана ад міжнародных тэндэнцый, установам трэба стварыць “працуючыя” ўмовы для абмену досведам паміж выкладчыкамі з беларускіх юрыдычных факультэтаў і іх замежнымі калегамі, прыцягнення замежных калег для працы ў Беларусі, фінансавання дадатковага юрыдычнага навучання выкладчыкаў за мяжой, спрашчэння правілаў прыняцця дапамогі ад замежных і міжнародных устаноў, арганізацыі курсаў па вывучэнні прафесійнай замежнай лексікі, спрыяння публікацыям беларускіх выкладчыкаў у замежных навуковых часопісах.

- **Пераняць найлепшыя міжнародныя практыкі навучання і працы са студэнтамі**

Беларускай юрыдычнай адукацыі варта развіваць, перш за ўсе, юрыдычную бібліятэку шляхам адкрыцця доступу да існуючых онлайн-рэсурсаў. Некаторыя рэсурсы могуць даваць доступ па зніжаных коштах альбо бясплатна.

Добрую рэпутацыю ўніверсітэта нельга ўявіць без удзела студэнтаў у міжнародных юрыдычных спаборніцтвах і канферэнцыях, таму беларускім

установам юрыдычнай адукацыі трэба больш заахвочваць студэнтаў да ўдзела ў іх.

Праблема з працаўладкаваннем студэнтаў можа быць часткова вырашана праз стварэнне ўніверсітэцкіх кар'ерных цэнтраў, роля якіх палягае ў наладжванні кантактаў з патэнцыйнымі працадаўцамі і падрыхтоўцы студэнтаў да паспяховага ўладкавання на працу. Як адзначае Канцэпцыя аб развіцці юрыдычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь да 2025 года, сістэме юрыдычнай адукацыі бракуе высокапрафесійных кадраў, здольных прымяняць веды на практыцы. Таму варта рабіць акцэнт на развіцці навуковай дзейнасці студэнтаў праз увядзенне курсаў па акадэмічным пісьме і стварэнне цэнтраў па дапамозе рэдакцыі навуковых тэкстаў.

# Пра аўтараў

**Яраслаў Крывой** – заснавальнік Цэнтра Астрагорскага, прафесар, старшы навуковы супрацоўнік Брытанскага інстытута міжнароднага і параўнальнага права і сябра Акадэміі вышэйшай адукацыі (FHEA). Выпускнік Гарвардскай шолы права, навучаўся ў Санкт-Пецярбургскім і Беларускім дзяржаўным універсітэтах. Працаваў у буйных юрыдычных фірмах у Злучаных штатах Амерыкі, Расіі і Вялікабрытаніі. Выкладаў права у Беларускім дзяржаўным універсітэце, а таксама у брытанскіх універсітэтах, Японіі і Шры-Ланцы. Паходзіць з Мінску. Асабістая старонка ў інтэрнэце www.kryvoi.net. Спецыялізацыя: адукацыя, міжнароднае публічнае права, вырашэнне міжнародных спрэчак, бізнэс-клімат.

**Раман Мароз** – даследчык ў галіне параўнальнага права, Лонданская школа эканомікі і палітычных навук. Атрымаў дыплом Універсітэта Мантэск'ё Бардо IV у сферы паліталогіі і еўрапейскіх даследаванняў. Магістр юрыдычных навук (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), магістр права (Універсітэт Нотр-Дам). Кансультант Сусветнага банка. З 2017 года вядзе навуковае даследванне ў галіне параўнальнага права ў Лонданскай школе эканомікі і палітычных навук.

# Пра Цэнтр Астрагорскага

Цэнтр Астрагорскага – гэта аналітычны цэнтр, які займаецца аналізам і распрацоўкай рэкамендацый па праблемах, з якімі сутыкаецца Беларусь на шляху да рынкавай эканомікі і праваވой дзяржавы.

Цэнтр быў заснаваны беларусамі, што маюць заходнюю адукацыю і разумеюць выклікі пераходнага перыяду ў рэгіёне, бо перажылі іх на ўласным досведзе. Аналітыкі Цэнтра працуюць у Мінску, Лондане, Варшаве, Стакгольме і Берліне.

Глыбокае разуменне беларускай рэчаіснасці дапамагае Цэнтру вырашаць складаныя аналітычныя і навучальныя задачы. Нашы аналітыкі рэгулярна публікуюцца на беларускай, рускай, ангельскай, нямецкай, польскай і французскай мовах.

Цэнтр мае на мэце пашыраць ідэі развіцця канкурэнтнай эканомікі і эфектыўнага кіравання. Таксама Цэнтр імкнецца спрыяць інтэграцыі беларускіх навукоўцаў і аналітыкаў у агульнаеўрапейскую і сусветную медыя- і навуковую супольнасць.

Цэнтр арганізуе тры штогадовыя падзеі: Ostrogorski Forum і канферэнцыю па рэформе адукацыі ў Мінску, а таксама Штогадовую лонданскую канферэнцыю па беларускіх даследаваннях у супрацоўніцтве з Універсітэцкім каледжам Лондана.

Ostrogorski Centre BelarusDigest

Дакумент даступны на:
http://belarusdigest.com/papers/legal-education-reform-belarus.pdf